**Юрый БЕЛЕНЬКІ**

*Нарадзіуся 5 мая 1960 г. у горадзе Мінску у сям'і рабочых. Беларус.*

*У 1982 г. закончыу Беларускі дзяржауны інстытут народнай гаспадаркі па спецыяльнасці "фінансы і крэдыт".*

*З 1982 г. па 1984 г. працавау кантралерам-рэвізорам Кантрольна-рэвізійнага упраулення Міністэрства фінансау Беларусі па Магілеускай вобласці.*

*З 1984 па 1986 г. служыу у арміі. Афіцэр запасу.*

*Пасля службы у войску, з 1986 г. і па цяперашні час працуе на пасадзе начальніка фінансавага аддзела Мінскага завода "Ударнік" канцэрна "Амкадор". Па накіраванню прадпрыемства у 1990 г. прайшоу у Англіі курс навучання па банкаускай справе і фінансах, у 1994 г. у Германіі па пытаннях сістэмных трансфармацый эканомікі.*

*У 1990 г. быу абраны дэпутатам Вярхоунага Савета Рэспублікі Беларусь і дэпутатам Мінскага гарадского савета. Адзін з 30-ці дэпутатау апазіцыі Беларускага народнага фронта у Вярхоуным Савеце. Член грамадскага кабінета міністрау БНФ. Адзін з аутарау "Канцэпцыі эканамічнай рэформы у Беларусі" Беларускага народнага фронта, канцэпцыі, правільнасць якой пацвержана жыццем у практыцы такіх краін, як Чэхія ці Эстонія, дзе адбываецца рост вытворчасці і расце дабрабыт людзей.*

Юрый БЕЛЕНЬКІ

-Эканаміст-прафесіянал высокага класа, што прызнаюць нават палітычныя апаненты.

- Прафесіянал-парламентарый, па ацэнках айчынных і замежных журналістау, што асвятляюць сесіі Вярхоунага Савета, увайшоу у склад 20-ці найбольш падрыхтаваных для парламенцкай дзейнасці дэпутатау.

- Разам з Ю.Беленькім грамадскі урад - каманда лепшых прафесіяналау Беларусі, у першую чаргу, эканамістау.

- Ен ведае што рабіць, яго распрацоукі пацверджаны жыццем у іншых краінах.

- Яму не трэба часу на "раскачку", ен мае пяцігадовы парламенцкі вопыт.

- Ен сумленны і прынцыповы чалавек - яго не здольны купіць ці зламаць ні "кебічы", ні "лукашэнкі".

- Ен зауседы адкрыты да простых людзей, аб гэтым ведаюць яго выбаршчыкі; ім праведзена больш за 100 сустрэч з жыхарамі у 60 раенах Беларусі.

- Яму 35 год, ен малады і поуны энергіі.

Кандыдат у дэпутаты Вярхоунага Савета



# Юрый БЕЛЕНЬКІ

Куйбышауская выбарчая акруга № 249.

vytoki.net

Me... ory Archives
Arch... ... Historye
Fo... 6 sprava 96

Юрый БЕЛЕНЬКІ

*Эканаміст-практык. Праца на заводзе, у рэальнай эканоміцы, веданне праблем людзей, якія ствараюць дабрабыт краіны, веданне макраэканомікі - аснова, на якой ен грунтуецца у сваей дзейнасці.*

*Дакладнасць эканамічных прагнозау, ацэнак, іх выверанасць і абгрунтаванасць вымушалі прызнаваць прафесіяналізм Ю.Беленькага. Гэта прызнавалі не толькі сябры, але і палітычныя апаненты,- як, напрыклад, Кебіч або Багданкевіч. Аб гэтым пісала прэса, нават "Советская Белоруссия" (09.06.90), "Рэспубліка" (21.12.92), аб гэтым гаварылі дэпутаты, у тым ліку і тыя, якія не уваходзілі у Апазіцыю: "Калі ва урадзе з'явяцца такія асобы, як Заблоцкі і Беленькі, мы хутка рушым наперад." ("Звязда", 28.02.92). Амаль усе прапановы Беленькага і яго калег па Апазіцыі сенняшні Вярхоуны Савет адкінуу, але прайшоу час, і жыцце пацвердзіла іх правільнасць. Пацвердзілі іх правільнасць і парламенцкія журналісты, якія уключылі Ю.Беленькага у дваццатку найбольш прафесійных і падрыхтаваных дэпутатау, аб чым і напісала "Народная газета" у сваім нумары ад 25 сакавіка 1995г.*

Юрый БЕЛЕНЬКІ

У новым Вярхоуным Савеце разам з камандай прафесіяналау будзе дамагацца:

- Ажыццяуленя распрацаванай праграмы аздараулення эканомікі:
- Будзе стабілізавана грашова-крэдытная сістэма, спынены рост цэн.
- Будзе праведзена прыватызацыя на карысць народа, а не наменклатуры (як у Чэхіі). Рэальны кошт прыватызацыйнага чэка павялічыцца у 30-35 разоу.
- Будуць кампенсаваны уклады у ашчадных банках, што знішчаны інфляцыяй. Пры прыватызацыі частка дзяржаунай маемасці будзе рэалізаваная для кампенсацыі укладау.
- Будзе павышана пакупніцкая здольнасць насельніцтва, павышаны зарплаты, пенсіі, пасобіі.
- Будуць зніжаны падаткі, яны будуць мець стымулюючы характар.
- Беларусь будзе атрымліваць плату за трубаправодныя і іншыя перавозкі.
-Будуць створаны умовы для інвестыцый. Дзяржава будзе гарантаваць інвестыцыі.
- Будзе праведзена рэструктурызацыя прамысловасці.
- У сельскай гаспадарцы на базе усіх формау уласнасці будуць узаконены усе формы гаспадарання: калгасы, аграфірмы, фермерскія гаспадаркі і інш.

Юрый БЕЛЕНЬКІ

- За захаванне нейтралітэту Беларусі і няудзел яе у чужых войнах.
- За раунапрауныя, добрасуседскія адносіны з усімі краінамі.
- За вырашэнне жыллевай праблемы шляхам комплексных мерапрыемствау (будауніцтва дзяржаунага жылля, прадастауленне ільготных доугатэрміновых крэдытау, увядзенне прагрэсіунага падаткаабкладання для уладальнікау шыкоуных катэджау).
- За дзяржауную дапамогу моладзі і студэнцтву - прадастауленне маладым сем'ям ільготных (беспрацэнтных) крэдытау на набыцце і будауніцтва жылля; неабходна вызваліць ад службы у войску студэнтау. Павінна быць абавязковае працауладкаванне для выпускнікоу.

За тое, каб:

- Пенсіянеры мелі спакойную, забяспечаную старасць. Будзе створаны паунацэнны дзяржауны пенсійны фонд.
- За справядлівае функцыянаванне моу, замацаванае Канстытуцыяй Беларусі (артыкул 17, раздзел 1): "Дзяржаунай мовай Рэспублікі Беларусь з'яуляецца беларуская мова. Рэспубліка Беларусь забяспечвае права карыстання рускай мовай як сродкам міжнацыянальных зносін".

vytoki.net